Эканомія на спажыванні цеплавой, электрычнай энергіі і вады — гэта не адмаўленне ад камфорту, а забеспячэнне неабходных умоў пражывання шляхам рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў.

СТАР. 2

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Спецыяльна для «Звязды» Адам Мальдзіс пагадзіўся паразважаць пра Францыска Скарыну, перспектывы развіцця беларускай нацыі, а таксама падзяліўся планамі і тым, што яго сёння турбуе.

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

19 ЛІПЕНЯ 2013 г. ПЯТНІЦА № 132 (27497) Кошт 1800 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

УЗНАГАРОДЫ ШМАТДЗЕТНЫМ МАЦІ

За нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей Прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў ордэнам Маці шматдзетных жанчын Гомельскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 18 ліпеня, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Ордэна Маці ўдастоены шліфавальшчык гомельскага ТАА «Мілата» Алена Саўчанка, паштальён аддзялення паштовай сувязі Драгунск Рагачоўскага раённага вузла паштовай сувязі Вера Якушава, работніца СВК «Доцішкі» Воранаўскага раёна Валянціна Вайткун, хатнія гаспадыні Алеся Слепава, Ларыса Ярмак і Святлана Зінькевіч, медсястра Быхаўскай цэнтральнай раённай бальніцы Валянціна Бельская і іншыя.

ПРАЦА ЧАЛАВЕКА НЕ ЗАСТАЕЦЦА НЕЗАЎВАЖАНАЙ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўручыў учора дзяржаўныя ўзнагароды заслужаным людзям краіны, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У спісе ўзнагароджаных больш як 100 чалавек. Гэта прадстаўнікі прамысловага комплексу, транспарту, будаўнічай галіны, сельскай гаспадаркі, аховы здароўя, навукі, адукацыі, спорту і культуры. Яны ўдастоены высокіх узнагарод за шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, асабісты ўклад у дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў.

Міхаіл Мясніковіч адзначыў уклад узнагароджаных у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. «Цудоўна, што сёння ў гэтай зале, што ўжо стала добрай традыцыяй, прысутнічаюць прадстаўнікі практычна ўсіх прафесій, усіх відаў дзейнасці. Гэта сведчыць аб тым, што ў нас на любым участку праца чалавека, яго ініцыятыва і добрасумленныя адносіны да справы не застаюцца незаўважанымі», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Высокімі ўзнагародамі адзначаюцца людзі, якія ўнеслі найбольшы ўклад у развіццё эканомікі краіны і яе сацыяльнай сферы. Такія людзі з'яўляюцца і своеасаблівымі маякамі, на якія павінны раўняцца астатнія члены калектыву, звярнуў увагу Міхал Мясніковіч.

«Глыбокая мадэрнізацыя, якая ідзе ў нашай краіне, патрабуе, безумоўна, ініцыятывы, творчасці ад кожнага, няхай гэта будзе кіраўнік прадпрыемства або радавы работнік», — адзначыў прэм'ер-міністр. Неабходна сур'ёзная работа над рацыяналізацыяй вытворчасці, зніжэннем матэрыяла- і энергаёмістасці выпускаемых тавараў. Гэта дасць магчымасць павысіць канкурэнтаздольнасць прадукцыі, вырашыць пытанні матэрыяльнага ўзнагароджання людзей, якія ствараюць гэты тавар, у цэлым збалансаваць і аптымізаваць эканоміку.

Міхаіл Мясніковіч выказаў словы ўдзячнасці ўзнагароджаным. Звяртаючыся да вучоных, прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі, выкладчыкаў, настаўнікаў, прэм'ер адзначыў іх вялікі ўклад у развіццё інтэлектуальнага патэнцыялу беларускай нацыі. «Чалавек адбудзецца як асоба, толькі калі ён гарманічна развіты», — падкрэсліў ён.

На сацыяльную сферу ў сувязі з падрыхтоўкай да самастойнага жыцця падрастаючага пакалення ўскладаецца вялікая адказнасць, адзначыў Міхаіл Мясніковіч. «Трэба зрабіць усё, каб нашы дзеці выраслі дастойнымі грамадзянамі, сапраўднымі патрыётамі, законапаслухмянымі, якія любяць і паважаюць нашу краіну, яе традыцыі і, безумоўна, тымі людзьмі, якія глядзяць у будучыню і ўнясуць за кошт сваёй адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі ўклад у развіццё Беларусі», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Сярод узнагароджаных людзі адной з самых гуманных прафесій — медыцынскія работнікі. «Вы, паважаныя медыкі, ведаеце, што такое каштоўнасць чалавечага жыцця, і дзякуй вам за тое, што вы дастойна стаіце на варце здароўя нашых грамадзян», — звярнуўся прэм'ер-міністр да прадстаўнікоў медыцыны.

Звяртаючыся да работнікаў сферы культуры, Міхаіл Мясніковіч падкрэсліў: «Цудоўна, што майстрам нашай сцэны апладзіруюць многія гарады свету, і гэта сапраўды сведчыць аб тым, што ў нас высокаінтэлектуальная, багатая духоўна беларуская нацыя. Ваш уклад у развіццё нацыянальнага мастацтва, духоўнае, эстэтычнае выхаванне нашых грамадзян вельмі вялікі і заслугоўвае асаблівай удзячнасці».

Сярод работнікаў, удастоеных дзяржаўных узнагарод за ўзорнае выкананне службовых абавязкаў, ёсць і супрацоўнікі органаў, якія забяспечваюць законнасць і правапарадак. «У многім дзякуючы вашым намаганням спыняюцца спробы парушэння закону, раскрываюцца многія злачынствы», — звярнуўся прэм'ер-міністр да ўзнагароджаных.

«Яшчэ раз хачу падкрэсліць, што вы ўвасабляеце сабой сапраўды працавітую, стабільную Беларусь і сваім асабістым прыкладам пацвярджаеце, што добрасумленная праца — гэта залог дабрабыту нашай Айчыны, крыніца шчасця кожнага чалавека. Вялікі дзякуй за вашу працу, прафесіяналізм, ініцыятыву!» — сказаў Міхаіл Мясніковіч і пажадаў узнагароджаным моцнага здароўя і новых поспехаў у працы.

■ Хроніка аднаго палёту

Работнікі лесу лічаць перыяд выспявання і збору лясных ягад адным з самых небяспечных у вяснова-летнім сезоне. Тысячы людзей у гэты час выпраўляюцца ў блізкія і далёкія лясныя нетры назапашваць маліны і чарніцы. І хоць лясная ахова звяртаецца да насельніцтва з папярэджаннямі пра пажарную небяспеку, без пажараў лес у гэты час бывае рэдка. Таму без паветранай аховы лясоў, якую ў нас выконвае прадпрыемства «Беллесавія», абысціся немагчыма. Лётчыкам і паветраным пажарным-дэсантнікам сумаваць у гэты час не даводзіцца. Штодня яны здзяйсняюць патрульныя рэйды на бартах самалётаў «Ан-2» і «Іл-103», верталётах «Мі-2», каб своечасова зафіксаваць і нават абясшкодзіць вогненную пагрозу лесу. Ім, як у песні спяваюць, зверху бачна ўсё...

СТАР. 6

ГАРАЧЫ ЛЕС КЛІЧА... «МІ-2»

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

40 386

суб'ектаў гаспадарання было зарэгістравана ў краіне за першае паўгоддзе 2013 года. Сярод іх 10787 юрыдычных асоб і 29599 індывідуальных прадпрымальнікаў — гэта на 26% больш, чым за такі ж перыяд 2012-га. Самая вялікая колькасць юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў зарэгістравалася ў Мінску (3166 і 7649 адпаведна). Менш за ўсё юрыдычных асоб было зарэгістравана ў Гродзенскай вобласці (922), а прадпрымальнікаў — у Віцебскай (3039).

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 19.07.2013 г.

Долар ЗША	8850,00	▼
Еўра	11590,00	▼
Рас. руб.	273,00	■
Укр. грыўня	1086,46	▼

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 25°
Віцебск	+ 23°
Гомель	+ 26°
Гродна	+ 22°
Магілёў	+ 24°
Мінск	+ 22°

■ Май на ўвазе

КАВАРСТВА «ЗЯЛЁНАГА СЯБРА»...

Штогод адначасова з ягадна-грыбным пачынаецца і, перафразуючы назву вядомай тэлеперадачы, сезон «жахаў нашага лесу». Хтосьці губляе ў лесе арыентацыю, камусьці становіцца дрэнна ад спякоты ці ўкусаў насякомых, іншаму бокам выходзіць сустрэча са змеямі... На жаль, мы ўпарта забываемся, што, нягледзячы на ласкавае сонейка і матылькоў-кветачкі, лес быў і застаецца месцам небяспечным, асабліва для бестурботных і самаўпэўненых грамадзян.

Усяго тыдзень таму столінскім ратавальнікам давялося здымаць з дрэва на беразе Прыпяці мінчаніна. Сталічны госць прыехаў палюбавацца на прыгажосць Прыпяцкага заказніка і заблудзіўся. Калі на зямлю пачаў апускацца змрок, небарака, які страціў ужо надзею выбрацца на «вялікую зямлю» самастойна, залез на дрэва і набраў 103. Турыста знайшлі толькі каля 2 гадзін ночы. Дзякуй Богу, ён не меў патрэбы ў медыцынскай дапамозе.

Дарэчы, часцей за ўсё на Брэстчыне вяскоўцы і гараджане «губляюцца» ў Столінскім і Пружанскім раёнах. Гэта значыць, там, дзе лесу шмат, і багаты ён грыбамі і ягадамі. Першы пік традыцыйна прыпадае на час збору чарніц, другі — на журавінны час. Часам зборшчыкам ягад даводзіцца ў лесе нават начаваць. Знаходзяць іх, замерзлых і згаладалых, праз суткі, а то і праз двое.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 6

НА ВЫХАДНЫХ НАДВОР'Е САПСУЕЦЦА

Паводле слоў галоўнага сіноптыка Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людмілы Парашчук, ужо сёння ў сярэдзіне дня ў атмасферы пачнуць адбывацца змены.

«Цёплае і камфортнае надвор'е з характэрнымі для ліпеня сярэднясутачнымі тэмпературамі зменіць больш халоднае, ветранае і дажджлівае», — дадала яна. Такія перамены прынясе на тэрыторыю краіны халодны атмасферны фронт ад атлантычнага цыклона, які зараз трымае шлях праз Скандынаўскі паўвостраў на паўднёвы ўсход.

«Мінулай ноччу на тэрыторыі краіны яшчэ было без ападкаў, а ўдзень на большай частцы рэспублікі пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы», — сказала Людміла Парашчук. Пры гэтым па Віцебскай вобласці ў асобных раёнах чакаюцца моцныя ліўні. Вечар прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах месцамі шквалістае ўзмацненне з парывамі да 15-20 м/с. Тэмпература паветра ўдзень будзе ад 20 да 26 градусаў вышэй за нуль, па поўдні краіны паветра прагрэецца да 28 градусаў. «Такі комплекс неспрыяльных умоў надвор'я — навальніца, шквал, моцныя ліўні — адпавядае аранжаваму ўзроўню небяспекі», — падкрэсліла сіноптык.

Паводле слоў Людмілы Парашчук, на выхадных цыклон, асеўшы над цэнтральнымі раёнамі еўрапейскай Расіі, пакіне Беларусь у тылавой частцы. Пры гэтым паўночныя вятры прынясуць на тэрыторыю рэспублікі халоднае паветра. У многіх раёнах пройдуць дажджы, дзе-нідзе магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8-14 градусаў, удзень прагназуецца ад 14-16 вышэй за нуль па паўночным усходзе краіны, да плюс 20-22 у паўднёва-заходніх раёнах Брэсцкай вобласці. «Такі тэмпературны фон будзе на 2-5 градусаў ніжэй за кліматычную норму», — адзначыла Людміла Парашчук.

У пачатку наступнага тыдня цыклон, застаючыся малярухомым над суседнімі абласцямі Расіі, працягне ўтрымліваць у Беларусі халаднаватае надвор'е. На значнай частцы тэрыторыі рэспублікі будуць ісці кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7-14 са знакам плюс, днём — ад 15 да 22, па захадзе ў асобных раёнах будзе да плюс 24 градусаў.

«Толькі да наступных выхадных надвор'е ў Беларусі наладзіцца», — адзначыла Людміла Парашчук.

Кар. БЕЛТА.

АДЗНАКА: ВЫДАТНА!

Міністр спорту і турызму Аляксандр Шамко, сустракаючы ў Нацыянальным аэрапорце Мінск вялікую групу спартсменаў з XXVII Сусветнай летняй універсіяды, якая завяршылася ў Казані 17 ліпеня, даў высокую ацэнку іх выступленню.



Фота БЕЛТА.

«Вы сёння трыумфатары. Годны вынік на Сусветнай летняй універсіядзе, паказаны ў жорсткай канкурэнтнай барацьбе, вельмі ўражвае. Гэтыя спаборніцтвы былі асабліва прадстаўнічымі і рэкорднымі па колькасці ўдзельнікаў і краін. Медалі, якія вы заваявалі, ад гэтага набываюць яшчэ большую каштоўнасць. Думаю, вы прынеслі пачуццё вялікага эмацыйнага ўздыму людзям нашай краіны. Вашы вынікі вартыя таго, каб вас паважалі», — звяртаючыся да спартсменаў, падкрэсліў Аляксандр Шамко.

Ул. інф.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЛІТВА ВЯСНОЙ 2014 ГОДА ПАДАСЦЬ ЗАЯЎКУ НА ДАЛУЧЭННЕ ДА ЕЎРАЗОНЫ

Літва накіруе Еўракамісіі заяўку на далучэнне да еўразоны вясной 2014 года. Пра такі план урада краіны ў эфіры радыёстанцыі «Жыню радыяс» паведаміў прэм'ер-міністр Літвы Альгірдас Буткявічус.

«Літва цяпер цалкам адпавядае Маастрыхцкім крытэрыям для прэтэндэнтаў на прыём у еўразону», — падкрэсліў ён. Калі раней у краіне быў крыху перавышаны ўзровень інфляцыі, то, як адзначыў кіраўнік урада, «на працягу ўжо двух месяцаў фіксуецца дэфляцыя». «Работы па планаванні бюджэту на наступны год вядуцца ў строгай адпаведнасці з прынцыпамі фінансавай дысцыпліны», — заявіў Буткявічус. Літва мае намер перайсці на еўра ў 2015 годзе.

АБАВЯЗАЛІ ВЯРНУЦЬ $100 ТЫСЯЧ ЗА ДРЭННУЮ ВУЧОБУ

Жыхарку Казахстана, якая вучылася ў Канадзе па стыпендыі прэзідэнта краіны, аднак затым пазбавілася яе з-за дрэннай паспяховасці, абавязалі кампенсаваць дзяржаве 15 мільёнаў тэнге (каля ста тысяч долараў). Такое рашэнне, як перадае Tengrinews.kz, вынес Кастанайскі абласны суд. Па звестках выдання, дзяўчына атрымала прэзідэнцкую стыпендыю ў сакавіку 2006 года і была пазбаўлена яе ў 2009 годзе. У Казахстане дзейнічае праграма «Балашак», якая фінансуе атрыманне вышэйшай адукацыі за мяжой. Яе ўдзельнікі навучаюцца ў 200 вядучых ВНУ 23 краін свету. За ўсю гісторыю праграмы за непаспяховасць было адлічана больш як 70 чалавек.

СКЛАДЗЕНЫ РЭЙТЫНГ САМЫХ «СТРЭСАВЫХ» КРАІН

Спецыялісты агенцтва Bloomberg склалі рэйтынг з 74 краін, насельніцтва якіх часцей за іншых адчувае стрэсы. Чакана першыя радкі занялі дзяржавы, якія не вылучаюцца багаццем і развітасцю грамадска-сацыяльных інстытутаў, а таксама пакутуюць ад узброеных канфліктаў. У падліках аналітыкі арыентаваліся на такія паказчыкі, як колькасць забойстваў на 100 тысяч чалавек, памер ВУП на душу насельніцтва, узровень сацыяльнай няроўнасці, размах карупцыі, узровень беспрацоўя, ступень забруджвання паветра ў гарадах і сярэдняя працягласць жыцця. Самай «стрэсавай» краінай у свеце эксперты Bloomberg прызналі Нігерыю — яна набрала 70,1 бала. Другое месца рэйтынгу заняла Паўднёвая Афрыка з 70 баламі. Следам ідуць Эль-Сальвадор, Манголія, Гватэмала, Калумбія, Пакістан, Ямайка, Македонія і Балівія.

Таксама ў ліку краін, якія набралі больш за 50 «стрэсавых» балаў — Іран, Венесуэла, Боснія і Герцагавіна. На 14-й пазіцыі рэйтынгу — Індыя (48,9 бала), 15 месца — Егіпет (46,3), 17-е — Бразілія (45,3). Расія са сваімі 43,8 бала размясцілася на 25 радку рэйтынгу з суседзямі — Інданэзіяй і Балгарыяй. Самымі спрыяльнымі з пункту гледжання адсутнасці стрэсу даследчыкі назвалі Нарвегію (5,4 бала), Люксембург (7,1) і Швейцарыю (9,2). Не надта шмат нервуюцца і жыхары ЗША, якія апынуліся на 54 месцы (25,7 бала), Вялікабрытаніі (24,6), Францыі (22,8) і Германіі (16,6).

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ПАЛЯКІ АДМОВІЛІСЯ АД «ДЗЁН ДОБРАСУСЕДСТВА» З УКРАІНАЙ

Польшча сёлета не будзе праводзіць сумесны з Украінай фестываль «Еўрапейскія дні добрасуседства», які быў намечаны на 10-11 жніўня. Пра гэта піша Gazeta Wyborcza са спасылкай на аднаго з арганізатараў мерапрыемства, старасту памежнай воласці Мірчэ (Люблінскае ваяводства) Леха Шапінскага. Ён падкрэсліў, што прыняў рашэнне аб адмене фестывалю аднаасобна.

Як украінскі бок адрэагаваў на гэта, не паведамляецца. Падставай для такога рашэння, па словах Шапінскага, стаў інцыдэнт у Луцку, дзе ўкраінец раздушыў яйка на плячы прэзідэнта Польшчы Браніслава Камароўскага. Акрамя таго, старасту абурыла пастанова Валынскай абласной рады, якая асудзіла рэзалюцыю польскага Сейма з нагоды Валынскай разні (у названай рэзалюцыі падзеі 70-гадовай даўніны былі названыя «этнічнай чысткай з прыкметамі генацыду»). «Я лічыў, што на самой справе ўсё ідзе да лепшага, што нашы адносіны — палякаў і ўкраінцаў тут, на памежжы, — фактычна становяцца ўсё лепш. Але відаць, што дэманы лютуюць. А калі хтосьці абражае нашага прэзідэнта, то абражае нас», — цытуе выданне словы Шапінскага.

ISSN 1990 - 763X

СЭКАНОМЛЕНЫЯ ГРОШЫ Ў ЖКГ ПОЙДУЦЬ НА МАДЭРНІЗАЦЫЮ

Прыкладна тры месяцы застаецца да пачатку новага ацяпляльнага сезона. Да яго рыхтуюцца. Больш за ўсіх гэта адчуваюць жыхары шматпавярховых дамоў, якія вымушаны два тыдні запар грэць ваду ў каструлях ды тазіках. Спецыялісты ж павінны тым часам правяраць трубы і іншае сантэхнічнае абсталяванне на трываласць, каб не апынуцца сведкамі непрыемных «сюрпрызаў» пасярод зімы. Але як жа насамрэчідзе гэтая падрыхтоўка?

— Мы працуем зараз у планавым парадку. Якіхсьці сур'ёзных зрываў і адставанняў ад графіку няма. У асноўным па ўсіх відах работ мы «перавалілі за экватар», — канстатаваў **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі Анатоль ШАГУН.** — І рыхтуемся да працы ў новых умовах.

А новыя ўмовы азначаюць кардынальную змену падыходу да фінансавання арганізацый гаспадаркі. Зараз яны атрымліваюць грошы па стратным прынцыпе. Гэта значыць, што пры перарасходзе выдзеленай раней сумы проста звяртаюцца па дадатковыя субсідыі ў дзяржаўны бюджэт. І тым самым не праяўляюць ніякай цікавасці да зніжэння выдаткаў — усё ж аплаціць казна. У хуткім часе сістэма фінансавання стане планава-разліковай. Гэта азначае, што кожнай арганізацыі будзе адзін раз выдаткавана з бюджэту пэўная сума. Калі нейкую частку яе сэканомяць, то 70% ад ашчаджаных грошай пойдуць на мадэрнізацыю самой сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Астатні капітал мяркуецца накіраваць на прэміраванне супрацоўнікаў.

— Але калі выдаткі перавысяць план, то супрацоўнікам такіх устаноў давядзецца пацярпець фінансава. Ніякага дадатковага пакрыцця страт за кошт казны, як гэта адбываецца зараз, больш не будзе, — падкрэсліў Анатоль Шагун.

Адзін з кампанентаў мадэрнізацыі гаспадаркі — асучасненне сістэм ацяплення. У сямідзясятыя гады ў буйнапанельным домабудаўніцтве з'явілася своеасаблівае «ноу-хау» — батарэі, умураваныя ў сцены. Гэтая сістэма аказалася вельмі энергазатратнай, і таму ад яе адмовіліся праз дваццаць гадоў. Але за гэты час былі ўзведзены сотні такіх дамоў. Тым не менш, па словах Анатоля Шагуна, масавага вынасу батарэй ацяплення са сцен у памяшканні чакаць не варта. Гэта робіцца хіба што пры капітальным рамонце. Аднак нават у сталіцы ёсць шматпавярховыя дамы, тэрмін эксплуатацыі якіх ужо пераваліў за трыццаць пяць гадоў, а рамонт у іх пакуль толькі плануецца. Самім жыльцам за мадэрнізацыю батарэй ацяплення брацца рызыкоўна. За самаўпраўства камунальшчыкі пакараюць рублём, бо ў доме будуць зменены гідраўлічныя параметры, і недахоп цяпла рызыкуюць адчуць суседзі. Таму застаецца толькі адзіны законны варыянт рашэння праблемы — рабіць адпаведны праект такой перапланіроўкі, што пацягне за сабой марнаванне часу, сіл і грошай...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ДЭФІЦЫТ МЕДРАБОТНІКАЎ І БУДАЎНІКОЎ

Самымі запатрабаванымі на рынку працы сёння з'яўляюцца ўрачы і медсёстры, а таксама спецыялісты будаўнічага профілю. Пра гэта сведчыць аналіз балансу вакансій найбольш масавых прафесій, паведамілі ва ўпраўленні палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Так, у гарадскіх службах занятасці зарэгістравана 10 беспрацоўных урачоў, а патрэба ў іх (зыходзячы з колькасці вакансій, заяўленых наймальнікамі) у 100 з лішнім разоў больш — 1024. Попыт наймальнікаў на медыцынскіх сясцёр у гарадах амаль у 50 разоў перавышае прапанову: на 1414 вакансій умоўна прэтэндуюць 30 беспрацоўных з адпаведнай сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. Для 10 беспрацоўных фельчараў таксама маецца шырокі выбар рабочых месцаў у гарадах краіны — 140. Дарэчы, год таму вакансій работнікаў аховы здароўя было значна менш.

Зрэшты, урачы і медсёстры нарасхват не толькі ў гарадах, але і ў вёсцы. Так, у сельскай мясцовасці не хапае 54 урачоў і 63 медыцынскіх сясцёр, а дыплом аб заканчэнні медыцынскай ВНУ і ССНУ маюць 1 і 10 сельскіх беспрацоўных медыкаў адпаведна.

У параўнанні з папярэднімі гадамі кардынальна змянілася сітуацыя з пошукам працоўнага месца для бухгалтараў, эканамістаў і юрыстаў. Калі раней колькасць беспрацоўных з такімі дыпломамі значна перавышала колькасць прапанаваных працоўных месцаў, то па звестках на 1 чэрвеня попыт значна перавысіў прапанову.

Напрыклад, у гарадской мясцовасці 212 дыпламаваных беспрацоўных бухгалтараў умоўна прэтэндуюць на 448 вакансій. Дарэчы, і ў сельскай мясцовасці сітуацыя аналагічная: на 35 беспрацоўных бухгалтараў — 131 вакансія. У органах па працы, занятасці і сацабароне рэспублікі зарэгістравана 138 беспрацоўных гараджан з дыпломам эканаміста, а патрэба наймальнікаў у іх у 1,3 раза вышэй — 183 вакансіі. У спісе працанедастатковых прафесій у гарадах упершыню апынуліся юрысты, юрысконсульты: на 66 прэтэндэнтаў прыпадае 113 вакансій.

Што тычыцца іншых спецыялістаў і служачых, то ў гарадах назіраецца дэфіцыт праграмістаў (16 чалавек на ўліку па беспрацоўі, 167 вакансій), інжынераў (135 беспрацоўных, 470 вакансій), прарабаў (17 і 138), а таксама выхавальнікаў (63 і 291). У вёсцы таксама адзначаецца павышаны попыт на інжынераў. Але асабліва неабходныя для сельскіх наймальнікаў ветурачы (на 4 беспрацоўных — 284 вакансіі), заатэхнікі (на 3 беспрацоўных — 276 прапаноў працоўнага месца), аграномы (13 і 129).

Тэрытарыяльны дысбаланс існуе не толькі ў дачыненні да спецыялістаў і служачых, але і ў дачыненні да рабочых, адзначылі ў міністэрстве. Так, у гарадах у фаворы ў наймальнікаў муляры (на 317 беспрацоўных — 2310 прапаноў наймальнікаў), бетоншчыкі (на 157 беспрацоўных — 990 вакансій), маляры (230 і 1040 адпаведна), тынкоўшчыкі (287 і 1364) і іншыя спецыялісты будаўнічага профілю. Па-ранейшаму запатрабаваны слесары, вадзіцелі аўтамабіля, электраманцёры, электрагазазваршчыкі, прадаўцы, швачкі, кандуктары і г.д. А на вёсцы сярод самых дэфіцытных рабочых прафесій — трактарысты-машыністы (40 беспрацоўных пры 662 вакансіях), трактарысты (81 і 394 адпаведна), вадзіцелі аўтамабіля (136 і 541), аператары машыннага даення (88 і 645). Варта адзначыць, што сітуацыя на сяле за год прыкметна змянілася ў лепшы бок, і беспрацоўных стала значна менш практычна па ўсім спектры рабочых прафесій.

БЕЛТА.

МІНГАНДАЛЬ УЗМАЦНЯЕ КАНТРОЛЬ ЗА СПАЖЫВЕЦКІМ РЫНКАМ

Указам Прэзідэнта «Аб некаторых мерах па аптымізацыі сістэмы дзяржаўных органаў і іншых дзяржаўных арганізацый, а таксама колькасці іх работнікаў», акрамя іншага, папоўнены спіс задач і функцый Міністэрства гандлю. Гаворка ідзе пра кантроль за выкананнем арганізацыямі і грамадзянамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, заканадаўства, якое вызначае правілы аптовага і рознічнага гандлю, выкананне работ, аказанне паслуг, патрабаванні да якасці тавараў, якія рэалізуюцца, а таксама рэгулюе дысцыпліну цэн і абарону спажывецкага рынку. Рэалізацыя гэтых функцый і задач ускладзена на створанае 1 ліпеня гэтага года ўпраўленне кантролю спажывецкага рынку — гандлёвую інспекцыю Міністэрства гандлю.

Беларускае заканадаўства ў дастатковай меры рэгулюе дзейнасць у сферы гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, абароны правоў спажыўцоў і рэкламнай дзейнасці. «Аднак рэгуляванне — гэта не толькі прыняцце рашэнняў, але і кантроль іх выканання», — звярнуў увагу начальнік новага ўпраўлення Валяр'ян Бяспалы.

Сёння на прадпрыемствах гандлю і грамадскага харчавання, паводле інфармацыі Мінгандлю, сістэматычна выяўляюцца розныя парушэнні правілаў гандлю і абслугоўвання грамадзян. У залежнасці ад рэгіёна, гэты паказчык даходзіць да 60-80%. У сферы бытавога абслугоўвання ў ходзе кантрольных мерапрыемстваў парушэнні выяўляюцца практычна падчас кожнай праверкі. У асноўным гэта абважванні, аблічванні, а таксама продаж няякаснага і небяспечнага тавару. «У сувязі з гэтым задачай дзяржаўнай важнасці з'яўляецца абарона грамадзян ад такіх парушэнняў, забеспячэнне дзяржаўных гарантый абароны правоў спажыўцоў, зніжэнне сацыяльнай напружанасці», — адзначыў Валяр'ян Бяспалы. Паводле яго слоў, асноўнай функцыяй упраўлення з'яўляецца правядзенне комплексных мерапрыемстваў па выяўленні, спыненні і папярэджанні правапарушэнняў у сферах гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання насельніцтва і абароны правоў спажыўцоў. «У сферы кантролю ўпраўлення знаходзіцца больш за 72 тысячы аб'ектаў і амаль 120 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. Наша задача — дамагчыся навядзення парадку і выканання заканадаўства кожным суб'ектам гаспадарання», — растлумачыў прадстаўнік Мінгандлю.

Валяр'ян Бяспалы падкрэсліў, што сучасны стан спажывецкага рынку краіны дыктуе неабходнасць захавання кантрольна-наглядной дзейнасці, надання ёй большай дынамічнасці і эфектыўнасці. «Але гэта не значыць, што кантроль трэба зрабіць больш жорсткім у форме праверак дзейнасці суб'ектаў гаспадарання і грамадзян, а сведчыць пра мэтазгоднасць развіцця аналітычнай і прафілактычнай функцый кантрольна-наглядной дзейнасці. У сувязі з гэтым дзейнасць гандлёвай інспекцыі будзе мець пераважна прафілактычны і папераджальны характар».

Сёння ўпраўленне ўжо праводзіць маніторынгі ў сферах, якія рэгулюе. Плануецца, што вынікі маніторынгаў і праверак будуць разглядацца штомесяц на калегіі ведамства.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ Карысныя парады

САКРЭТЫ ХАТНЯЙ ЭКАНОМІІ

Эканомія на спажыванні цеплавой, электрычнай энергіі і вады — гэта не адмаўленне ад камфорту, а забеспячэнне неабходных умоў пражывання шляхам рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў. Прапануем пазнаёміцца з элементарнымі правіламі, выконваючы якія, вы зможаце істотным чынам перараз-меркаваць выдаткі ў сваім сямейным бюджэце.

Эканомім электрычную энергію

1. Сучасныя электрапрыборы маюць маркіроўку ўзроўню энергаспажывання. Сістэма энергетычнай маркіроўкі ўключае ў сябе 7 класаў. Набываючы новую бытавую тэхніку, звяртайце ўвагу на клас энергаэфектыўнасці. Больш высокі клас (A+, A або B) азначае, што выдаткі электраэнергіі будуць меншымі ў параўнанні з такімі ж прыборамі больш нізкага класа (C, D, E, F, G).

2. Электрычныя пліты, пральныя і пасудамыйныя машыны, камп'ютары, хатнія кінатэатры і іншая бытавая тэхніка выдаткоўваюць шмат электраэнергіі, прычым нават у «рэжыме чакання» (калі апарат падключаны да сеткі і чакае сігналу ад пульта дыстанцыйнага кіравання). Не пакідайце абсталяванне ў рэжыме чакання — выкарыстоўвайце кнопкі ўключыць / выключыць на самім абсталяванні або адключайце іх ад разеткі.

3. Перавядзіце свой хатні камп'ютар на эканамічны рэжым працы (адключэнне манітора, пераход у спячы рэжым, адключэнне жорсткіх дыскаў).

4. Адключэнне прыбораў, якія не выкарыстоўваюцца, ад сеткі (напрыклад, тэлевізара, відэамагнітафона, музычнага цэнтра) дазволіць знізіць спажыванне электраэнергіі ў сярэднім да 300 кВт·г за год.

5. Зарадная прылада для мабільнага тэлефона, пакінутая падключанай да разеткі пры адсутнасці тэлефона, спажывае 95% энергіі, у той час як усяго 5% расходуецца непасрэдна пры яго зарадцы.

6. Больш эканамічным лічыцца кухонны посуд з тоўстым дном. Дно посуду для электрапліт павінна быць роўным і шчыльна датыкацца награвальнага элемента. Выкарыстанне скараваркі сэканоміць шмат сіл, грошай і, што асабліва прыемна, часу на прыгатаванне ежы.

7. Пры прыгатаванні ежы на электрычнай пліце сачыце за тым, каб дыяметр канфоркі не перавышаў дыяметр дна посуду. Гэта простае правіла засцеражэ канфорку ад паломкі, посуд — ад перагравання, а ваш кашалёк — ад перарасходу электраэнергіі.

8. Праверце вашу электраплiту. Калі канфорка дэфармавалася, варта неадкладна яе замяніць, паколькі пры няпоўным кантакце канфоркі з посудам таксама адбываюцца страты цяпла. Каструлі з няроўным дном спажываюць больш энергіі.

9. Прыгатаванне ежы пад накрыўкай не толькі захавае ў вашай страве вітаміны, але і скароціць час на яе прыгатаванне ў 3 разы.

10. Выкарыстоўвайце рэшткавае цяпло канфоркі і духоўкі ў электраплітах. Выключайце іх хаця б за 10 хвілін да гатоўнасці стравы.

11. Своечасова выдаляйце накіп з чайніка і награвальных прыбораў. Гэта падоўжыць тэрмін іх службы і паскорыць працэс награвання.

12. Імкніцеся кіпяціць такую колькасць вады, якая неабходна ў гэты момант, замест таго, каб дарэмна награваць яе «пра запас». Ведайце, вада губляе ўсе карысныя ўласцівасці з кожным наступным кіпячэннем.

13. На кухні адным з самых энергаёмістых бытавых прыбораў з'яўляецца халадзільнік. Выбірайце для халадзільніка самае прахалоднае месца, пажадана каля вонкавай сцяны, але ні ў якім разе не побач з плітой.

14. Самы эканамічны рэжым для халадзільніка — тэмпература + 5 градусаў і — 18 для маразільнай камеры. Павелічэнне тэмпературнага рэжыму на адзін градус павялічвае выдаткі энергіі на 5%.

15. Выкарыстоўвайце кнопку халадзільніка для хуткай замарозкі толькі пры неабходнасці, паколькі ў гэтым рэжыме расход электраэнергіі павялічваецца на 30-55%.

16. Абавязкова варта размарожваць маразільную камеру пры з'яўленні ў ёй лёду. Тоўсты пласт лёду пагаршае халаджэнне замарожаных прадуктаў і павялічвае спажыванне электраэнергіі.

17. Больш за ўсё электраэнергіі на падагрэў вады выкарыстоўваюць пасудамыйная і пральная машыны. Каб знізіць расход электраэнергіі, выбірайце аптымальны рэжым мыцця, мыйце бялізну пры поўнай загрузцы машыны.

18. Для мыцця сінтэтычных тканін выкарыстоўвайце рэжым мыцця ў халаднаватай вадзе. 85% энергіі пры мыцці выдаткоўваецца на нагрэў вады да зададзенай тэмпературы.

19. Велізарная колькасць электраэнергіі ідзе на асвятленне. Паклапаціцеся пра тое, каб лямпы дарэмна не свяцілі ў тых памяшканнях, дзе вас няма. Найбольш эфектыўна выкарыстоўвайце мясцовае, кропкавае асвятленне.

20. Выкарыстоўвайце энергазберагальныя лямпы. Нягледзячы на вялікі кошт, яны спажываюць энергіі прыкладна на 80% менш, чым традыцыйныя лямпы напальвання, а служаць у 8-10 разоў даўжэй.

21. Пры замене лямпы напальвання на энергазберагальную звярніце ўвагу на суадносіны магутнасці выпраменьвання і магутнасці, якая спажываецца. Выбірайце энергазберагальныя лямпачкі з максімальнай светлааддачай пры мінімальным спажыванні электраэнергіі.

22. Сыходзячы, гасіце свята! Гэта простае дзеянне павінна стаць для вас добрай звычкай, якая дапаможа сэканоміць сямейны бюджэт.

23. Не грэбуйце натуральным асвятленнем. Светлыя шторы, светлыя шпалеры і стол, чыстыя вокны, умераная колькасць кветак на падаконніках павялічаць асветленасць кватэры і паменшаць неабходнасць выкарыстання свяцільнікаў.

24. Максімальна выкарыстоўвайце натуральнае асвятленне, каб менш плаціць за штучнае. Варта ўлічваць, што запыленыя вокны зніжаюць натуральную асветленасць памяшкання на 30%.

25. Чым больш святла адлюстроўваюць сцены памяшканняў, тым менш светлавой магутнасці патрабуецца для асвятлення: гладкія белыя сцены адбіваюць 80% накіраванага на іх святла, цёмна-зялёныя — 15%, у той час як чорныя адбіваюць толькі 9% дзённага святла.

Захаваем цяпло вашага дома

26. Падумайце пра замену вокнаў на сучасныя энергаэфектыўныя, пластыкавыя альбо драўляныя. Падвойнае шкленне дазволіць знізіць страты цяпла праз аконныя праёмы ў некалькі разоў.

27. На зіму аконныя рамы можна заклеіць паперай. Гэта варта рабіць з унутранага боку і ў зацішнае надвор'е. Аднак лепш ужываць спецыяльныя ўшчыльняльныя матэрыялы, якія праслужаць некалькі гадоў. Тыя ж матэрыялы могуць прымяняцца для ўцяплення ўваходных дзвярэй (у тым ліку металічных).

28. Каб паменшыць страты цяпла праз вокны, на ноч апускайце жалюзі і завешвайце шторы. А ўдзень, наадварот, упускайце сонечнае святло ў ваш дом праз вокны, вызваленыя ад штор.

29. Шкленне балконаў і лоджый дазваляе знізіць агульныя цеплавыя страты на 10%. Падвойныя ўваходныя дзверы таксама дапамогуць зберагчы цяпло ў вашым доме.

30. Тоўсты дыван на падлозе створыць утульнасць у доме і мінімізуе страты цяпла праз падлогу.

31. Для павышэння цеплааддачы радыятары павінны быць чыстымі і звонку, і ўсярэдзіне. За многія гады эксплуатацыі яны бываюць забітыя ўнутранымі адкладамі, якія перашкаджаюць перадачы цяпла. Радыятары неабходна рэгулярна праціраць звонку, а прамываць знутры ў пачатку ацяпляльнага сезона павінна кіруючая арганізацыя — ЖЭС альбо таварыства ўласнікаў.

32. Усталяваўшы тэрмастатычны вентыль на радыятар ацяплення, вы зможаце, рэгулюючы колькасць цепланосьбіта, выстаўляць аптымальны тэмпературны рэжым у памяшканні.

33. Хаванне ацяпляльных прыбораў дэкаратыўнымі плітамі, панэлямі і нават шторамі зніжае паступленне цяпла ў памяшканне на 10%.

34. Паміж радыятарнай батарэяй і сцяной ўсталюйце ахоўны экран з алюмініевай фольгі. Фольга адбівае цяпло, якое выпраменьвае радыятар, і накіроўвае яго назад у пакой. Дзякуючы гэтаму можна сэканоміць да 4% выдаткаў на ацяпленне.

Вада — крыніца жыцця!

35. Прывядзіце ў парадак сантэхніку і ўсё абсталяванне водазабеспячэння. З крана, які капае, у суткі выцякае да 25 літраў вады, ці каля 720 літраў за месяц; з «бягучага крана» — да 145 літраў у суткі, або каля 4000 літраў за месяц; а ў выпадку працякання зліўнога бачка ў прыбіральні — да 2000 літраў вады за суткі ці каля 60000 літраў у месяц. Захавайце ваду і свае зберажэнні.

36. Ужыванне якасных распыляльнікаў-аэратараў (адмысловых насадак) на змяшальніках і душавых устаноўках дазваляе камфортна карыстацца вадой пры ўдвая меншым расходзе. Як правіла, такія насадкі на новых кранах маюцца ў камплекце і ўжо змантіраваныя ў заводскіх умовах.

37. Аднарычажны і тэрмастатны змяшальнікі забяспечваюць пастаянную тэмпературу вады, зніжаючы энергавыдаткі. Яны эканомяць значную колькасць гарачай вады.

38. Мыць посуд пад праточнай вадой марнатраўна двойчы: акрамя вады, павялічваецца расход мыйных сродкаў. Эканомней і зручней карыстацца дзвюма напоўненымі ракавінамі: у адной растваряецца сродак для мыцця, а ў другой посуд апалоскваюць. Выдатак вады зніжаецца ў дзясяткі разоў, эканомяцца мыйныя сродкі.

39. Не забывайце закрываць краны, калі не выкарыстоўваеце ваду.

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ па матэрыялах Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ

ЛЮДЗІ ЗГАРЭЛІ Ў КАНТЭЙНЕРЫ

У Віцебску ўнутры металічнага кантэйнера, які гарэў, знойдзены целы мужчыны і жанчыны.

— А першай гадзіне ночы паступіла паведамленне пра гарэнне смецця на тэрыторыі гаражнага-будаўнічага кааператыва № 9 на Маскоўскім праспекце,— паведаміла **Марына ФАНДО, прэс-сакратар Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях**. — У кантэйнеры былі знойдзены трупы мужчыны і жанчыны, асобы якіх устанаўліваюцца. Кантэйнер, які быў зачынены з сярэдзіны на кручок, з'яўляецца ўласнасцю кааператыва. Ён выкарыстоўваўся для захоўвання інвентару і інструмента. Прычына пажару высвятляецца.

Афіцыйны каментарый

Іна ГАРБАЧОВА, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта РБ па Віцебскай вобласці: *«Па гэтым факце Віцебскім гарадскім аддзелам Следчага камітэта праводзіцца праверка. Тэрмін правядзення праверкі складае 10 дзён. У выпадку неабходнасці яе тэрмін можа быць прадоўжаны да месяца. Прызначана судова-медыцынская экспертыза, якая дазволіць зрабіць канчатковую выснову аб прычыне смерці. Акрамя таго, у рамках праверкі будзе прызначана і праведзена пажарна-тэхнічная экспертыза. Зараз устанаўліваюцца асобы загінулых (папярэдне лічыцца, што гэта бяздомныя), прычына пажару. Паводле папярэдняй версіі, узгаранне мела месца з прычыны курэння ў стане алкагольнага ап'янення».*

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АД ЗЛОСЦІ ЖАНЧЫНЫ ЗАГАРЭЛІСЯ ДЗВЕРЫ СУЖЫЦЕЛЯ

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Першамайскага РУУС сталіцы затрымалі 38-гадовую рабочую ЖЭСа за... наўмысны падпал чужой маёмасці.

Цягам трох гадоў мінчанка сустракалася з мужчынам. У апошні час дама стала часцей выпіваць. Пасля чарговага загулу сужыцелькі, мужчына пасварыўся з ёй і пайшоў дадому. Наступным днём жанчына вырашала пайсці на міравую і завітала да пацярпелага дадому. Але дзверы аказаліся замкнутымі. Яна вырашыла адпомсціць: апусціла ў замочную шчыліну недакурак, потым запаліла запалку і ўставіла яе паміж дзвярамі і вушаком. Пераканаўшыся, што абіўка загарэлася, пайшла. Добра, што гаспадар своечасова адчуў пах дыму і паспеў затушыць агонь, а пасля выклікаў міліцыю. Зламысніцу затрымалі. Віну яна не адмаўляла. Сказала, што разумела небяспеку сваіх дзеянняў, але ў той момант злосць на каханага пераважыла...

Сяргей РАСОЛЬКА.

40 МІЛЬЁНАЎ — НА ВЕЦЕР

Каля Br40 млн страціла ў Лагойскім раёне 36-гадовая прадпрымальніца, якая прымае ягады ў насельніцтва, паведаміў карэспандэнту БЕЛТА начальнік Лагойскага раённага аддзела Следчага камітэта Беларусі Максім Дацькевіч.

«Прадпрымальніца займалася зборам ягад у насельніцтва. У вёсцы Моладзі яна паставіла скрынку з грашыма на дах сваёй машыны і паехала. Ад'ехаўшы ад населенага пункта, жанчына ўспомніла пра гэта, але скрынкі на даху ўжо не было. Вярнуўшыся, яна знайшла яе пустой», — сказаў Максім Дацькевіч. Ён таксама растлумачыў: «Такім чынам, грошы былі страчаны па ўласнай неасцярожнасці падчас руху аўтамабіля. Пакуль яны не знойдзены».

Па факце здарэння супрацоўнікі Лагойскага РАУС праводзяць праверку, высвятляюцца ўсе абставіны здарэння.

ФАКТЫ

ГУЧНАЯ СПРАВА

ЗНАЙШЛІ ЦЕЛА ЗНІКЛАЙ БЕЗ ВЕСТАК МІНЧАНКІ

Па Мінску з пачатку месяца былі развешаны заклікі аб дапамозе: знайсці Таццяну Слонімскую, якая знікла без вестак. Учора ва ўпраўленні Следчага камітэта па Мінскай вобласці паведамілі, што затрымалі падазраваных у забойстве жанчыны.

Апошні раз Таццяну бачылі 3 ліпеня 2013 года. Яна паехала на машыне да маці, а пасля планавала пазбіраць ягад у Мінскім раёне. «Учора следчая група паблізу вёскі Дварэц Мінскага раёна знайшла труп жанчыны з нажавым раненнем — як мяркуецца, грамадзянкі Слонімскай, — адзначылі ва УСК па Мінскай вобласці. — Удалося затрымаць і падазраваных у здзяйсненні забойства. Гэта жыхары Мінска ва ўзросце ад 20 да 25 гадоў». Маладыя людзі забілі жанчыну з карыслівых меркаванняў, бо хацелі завалодаць яе маёмасцю. Каб «замесці» сляды, закапалі труп. Пасля машыну жанчыны прадалі праз інтэрнэт у Расію. Па факце заведзена крымінальная справа.

Надзея ДРЫЛА.

■ Беларусь і свет

ДОКАЗ СПРАВАЙ

Сёмы візіт Прэзідэнта Беларусі ў Кітайскую Народную Рэспубліку 15—17 ліпеня стаў, верагодна, самым паспяховым з усіх. Кантракты на паўтара мільярда долараў, важныя палітычныя пагадненні, выказаная з абодвух бакоў гатоўнасць да інтэграцыі эканомік. Гэтыя вынікі самі па сабе сталі пераканаўчым адказам на сумненні, якія выказваюцца з розных бакоў, у тым, што ў адносінах Кітая і Беларусі ўсё сур'ёзна.

Не далей як некалькі месяцаў таму я прачытаў чарговую такую шматстаронкавую «працу», у якой аўтар пераконваў, што Беларусь для Кітая зусім і не партнёр, і больш за тое, наша краіна Кітаю зусім не цікавая. Усё не так. Кітайцы цэняць тое, што Беларусь першай з краін Еўропы выказала гатоўнасць да шырокамаштабнага супрацоўніцтва і фактычна яшчэ ў 1990-х стала надзейным партнёрам Паднябеснай, якая тады яшчэ дастаткова няўпэўнена адчувала сябе на міжнароднай арэне. Важна гэта для Кітая і цяпер, калі ён стаў другой па памеры сусветнай эканомікай, а па ступені ўплыву на эканамічныя падзеі ў свеце па многіх пазіцыях ужо выйшаў на першае месца. Менавіта ад тэмпаў росту кітайскай эканомікі цяпер залежаць цэны на нафту, газ і металы на глабальных біржах. А ўзровень партнёрства Беларусі і Кітая замацаваны падпісанай кіраўнікамі дзвюх краін дэкларацыяй, у якой заяўлена аб рашэнні наладзіць адносіны ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. Пры гэтым дэкларацыя не з'яўляецца проста наборам прыгожых фраз. Прынята рашэнне да канца года распрацаваць і ўзгадніць праграму

Гэтыя вынікі самі па сабе сталі пераканаўчым адказам на сумненні, якія выказваюцца з розных бакоў, у тым, што ў адносінах Кітая і Беларусі ўсё сур'ёзна.

па развіцці ўсебаковага стратэгічнага партнёрства, у якой на наступныя гады будуць прапісаны канкрэтныя крокі і напрамкі паўнамаштабнага супрацоўніцтва. Як адзначыў кіраўнік беларускага МЗС Уладзімір Макей: «Мы дамовіліся з кітайскімі партнёрамі, што адбудзецца сустрэча на ўзроўні прэм'ер-міністраў, якія дэталёва абмяркуюць усе пытанні далейшага паглыблення гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння». Паводле слоў віцэ-прэм'ера Беларусі Анатоля Тозіка, «такую праграму трэба складаць на бліжэйшыя 10 гадоў».

Цікавасць да працы ў Беларусі выказалі найбуйнейшыя кітайскія карпарацыі, якія маюць самыя інавацыйныя тэхналогіі сусветнага ўзроўню. Так, кітайская карпарацыя CNR плануе стварыць у Беларусі ліцейную і вагонабудаўнічую вытворчасць ААТ «БелАЗ». Праекты па выпуску крыягенных вагонаў-цыстэрнаў і вагонаў для Еўрасаюза з'яўляюцца заведама інавацыйнымі, і гэтая прадукцыя будзе адпавядаць найвышэйшым сусветным стандартам. Выпускаць іх будуць на базе Магілёўскага вагонабудаўнічага завода, які ўваходзіць у холдынг «БелАЗа». Дарэчы, гэтымі праектамі кітайская карпарацыя вырашыла не абмяжоўвацца. З МТЗ падпісана таксама пагадненне аб сумесным распрацоўцы электрапрывада для трактароў.

Шэраг мемарандумаў заключаны ў сферы энергетыкі. Так, на тэрыторыі СЭЗ «Магілёў» можа быць наладжана вытворчасць сонечных модуляў і ўзведзена фотагальванічная электрастанцыя магутнасцю 10 МВт. Яшчэ больш магутная фотагальванічная электрастанцыя можа быць пабудавана для прадпрыемства «Гомельшкло». Ёсць нядрэнныя перспектывы і ва ўдзеле кітайскіх кампаній у развіцці гідраэнергетыкі.

Выходзячы з існуючага трохмільярднага таваразвароту таксама абмяркоўваецца магчымасць стварэння сумеснай экспарта-імпартна-інвестыцыйнай кампаніі. Сёння ў таваразварот дзвюх краін уцягнута шмат замежных пасрэднікаў, якія атрымліваюць выгаду з геаграфічнай аддаленасці дзвюх краін. Стварэнне падобнай кампаніі дазволіць пазбавіцца ад часткі з іх, тым самым зрабіўшы кі-

Цікавасць да працы ў Беларусі выказалі найбуйнейшыя кітайскія карпарацыі, якія маюць самыя інавацыйныя тэхналогіі сусветнага ўзроўню.

тайскія тавары больш таннымі ў Беларусі, а беларускія — на тэрыторыі Кітая.

Якія перспектывы ёсць і ў галіне будаўніцтва. Патэнцыял супрацоўніцтва ў гэтай сферы паміж Беларуссю і Кітаем у бліжэйшыя 5—7 гадоў міністр архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Анатоль Нічкасаў ацаніў у $1 млрд долараў. Плануецца ўзвядзенне жылога раёна з выкарыстаннем тэхналогій энергазберажэння сусветнага ўзроўню. Гарызонты супрацоўніцтва вызначаны ў генеральным пагадненні паміж Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Беларусі і CITIC Construction Co., Ltd.

Зразумела, вялікая ўвага на сустрэчах надавалася кітайска-беларускаму індустрыяльнаму парку. Прэзідэнт Беларусі асабліва падкрэсліў, што на тэрыторыі гэтага парка павінен вырабляцца высокатэхналагічны прадукт. І перспектывы тут добрыя.

Каб падкрэсліць тое значэнне, якое сам кітайскі бок надае адносінам з Беларуссю, працытую кітайскае агенцтва навін «Сіньхуа». Яно наступным чынам апісала задачы, якія стаяць перад Кітаем і Беларуссю па выніках сустрэчы двух лідараў: «У эканоміцы неабходна ўсёабдымнае паглыбленне супрацоўніцтва, цэнтралізаванае планаванне супрацоўніцтва ў сферы інфраструктурнага будаўніцтва, машынабудавання, сувязі, будаўнічых матэрыялаў, энерганосьбітаў, хімічнай прамысловасці, фінансаў, практычнае садзейнічанне буйным праектам. Неабходна паляпшаць структуру гандлю, нарошчваць гандаль прадукцыяй з высокай дабаўленай вартасцю і прадукцыяй новых высокіх тэхналогій, садзейнічаць збалансаванаму росту двухбаковага гандлю. Неабходна пашыраць узаемныя інвестыцыі, ствараць сумесныя прадпрыемствы і кітайска-беларускія індустрыяльныя паркі».

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук

■

Кацярына ПЫТЛЕВА:

«Я ТАКАЯ, ЯКАЯ ЁСЦЬ, І АТРЫМЛІВАЮ АД ГЭТАГА ЗАДАВАЛЬНЕННЕ»

У кантэксце «чалавек выбірае прафесію ці яна яго» Кацярына Пытлева па-за межамі стандарту. У свой час, напрыклад, марыла пра генетыку і атрымала вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці. Толькі вось жыццё склалася так, што навуку выціснула творчасць. Нязменным засталося адно: працу заўсёды выбірае для душы. Працуе на радыё «Мір», агучвае музычныя навіны на канале АНТ, з'яўляецца аўтарам і вядучай праграм на інтэрнэт-тэлебачанні TUT.BY, піша вершы і прозу і з'яўляецца фронтвумен груп «Клёндайк» і «Soulkitchen». Пры гэтым спалучае ўсё настолькі гарманічна, што дзіву даешся: як толькі ўсё паспявае? Аказваецца, калі ты ў гармоніі з сабой, то і жыццё будзе будавацца па яе законах.

— Часта сустракаю творчых людзей, якія рэалізоўваюць сябе ў розных сферах, і ўзнікае пытанне: якое ў іх успрыманне часу?

— У жыцці для мяне існуе толькі тут і зараз. Я жыву тым, што раблю ў дадзены момант. Імкнуся не марнаваць час на разважанні пра тое, што было раней, і па мінімуму глядзець у будучыню. Стаўлю рэальныя, канкрэтныя мэты. У мяне, мабыць, няма звычнага ўспрымання выхадных і працоўных дзён, якія ёсць у большасці людзей. На радыё і на тэлебачанні час таксама па-іншаму ляціць. Бо, бывае, здаецца, што прайшла вечнасць, а ў рэальнасці ты гаварыў пра нешта толькі хвіліну. Ці наадварот ты расказваеш пра нешта, і столькі яшчэ трэба сказаць, а не паспяваеш. У гэтым сэнсе час расцягваецца на бясконцыя адрэзкі. Аднак калі любіш сваю працу і паглыбляешся ў яе, то час бяжыць незаўважна.

— Праграма «5х5» стала для вас першым крокам у прафесію?

— Яна была маёй «школай» журналістыкі. Потым яшчэ быў «універсітэт», калі працавала на Першым музычным, бо там усё было па-новаму, іншы падыход. А наогул праграма «5х5» была школай для кожнага, хто туды прыходзіў, нават калі потым не заставаўся ў прафесіі. Там вучыліся не толькі працаваць, але і жыць. Таму што ў юным узросце, прадстаўляючы цэнтральны тэлеканал, бралі на сябе адказнасць працы ў прамым эфіры. Гэта, між іншым, патрабавала сур'ёзна і адказна паводзіць сябе і па-за кадрам, у жыцці.

— Хто падтрымліваў і дапамагаў у тыя перыяды?

— У «5х5» гэта былі Іван і Тамара Пінігіны, бо яны нас усіх шукалі, вучылі і рабілі з нас тэлевядучых. На Першым музычным таксама была добрая каманда, якая дапамагла мне ў многім вырасці прафесійна. У асноўным мяне вучылі тыя справы, якімі я займалася, бо лепшы настаўнік — гэта вопыт. Каб яго атрымаць, трэба вельмі доўга нечым займацца. У мяне часта пытаюцца, ці хадзіла я на нейкія курсы, ці ставіла голас, а я разумею, што ўсе прафесійныя навыкі я спасцігла ў працэсе. Я ў многіх рэчах сама сабе настаўнік. І стараюся заўсёды аналізаваць зробленае, а не проста «свяціць тварам».

— Вы прыйшлі на тэлебачанне ў 14 гадоў. Ці прысутнічаў страх перад новым і невядомым?

— Памятаю, на першым сходзе «5х5» ахвотных патрапіць у праграму было чалавек сто. Я глядзела на іх, і мне здавалася, што ўсе такія таленавітыя, актыўныя, яркія, дарослыя, бо большасці было па шаснаццаць гадоў. Але гаворка тады ішла не аб працы вядучага, а пошуку маладых журналістаў, якія б дапамагалі ствараць праграму. Думкі наконт таго, што нехта лепшы за мяне, прысутнічалі, аднак практыка паказала — выбралі менавіта мяне.

— І нават ніякіх амбіцый не мелі?

— У мяне іх ніколі не было. Лічу, галоўнае — займацца тым, што табе падабаецца, атрымліваючы ад гэтага задавальненне, і дапамагаць людзям. Тым больш што я не збіралася звязваць з журналістыкай сваё жыццё. Яшчэ пасля дзявятага класа з марай быць праграмістам паступіла ў каледж. Скончыўшы адзінаццаты клас, наогул на паўгода пайшла з тэлебачання да першай сесіі, бо сур'ёзна была настроена стаць вучоным-біёлагам і займацца генетыкай. Вось, мабыць, дзе я мела амбіцыі — у навуцы. З часам пачала марыць аб працы на радыё, і неўзабаве такая магчымасць выдалася.

— Сёння дзе вам больш камфотна, на радыё ці на тэлебачанні?

— Я выбіраю такія месцы працы, дзе мне цікава, і адчуваю там сябе зручна. На тэлебачанні здараліся праекты, у якіх з мяне спрабавалі зрабіць таго, кім я не з'яўляюся. У асноўным я такая, якая ёсць, і атрымліваю ад гэтага задавальненне, бо не даводзіцца пераступаць праз сябе. Таму на радыё я заўсёды была больш шчырай і адчувала там сябе гарманічна.

— Значыць, калі прысутнічае момант «трэба пераступіць праз сябе», то можаце адмовіцца ад прапановы?

— Так часцей і адбываецца. У мяне гэта прынцып. Нейкі час я ішла на ўступкі, а зараз змяніла пазіцыю. Я ведаю, напрыклад, што магу працаваць на вяселлях, на карпаратывах вядучай, але не згаджаюся, бо разумею: не маё гэта, хоць і выгада тут відавочная.

— На радыё «Мір» вы вядучая ранішняга шоу «Працаголікі», а як ваш уласны дзень пачынаецца?

— Прачнуцца раніцай — гэта цэлы рытуал. Я доўга выпрацоўвала яго метадам спроб і памылак. Прыйшла да таго, што пачынаецца раніца з кантрастнага душу, потым я раблю пэўны набор практык з ёгі. Яна дапамагае мне сабрацца з думкамі і прыслухацца да сябе. Зранку стараюся абавязкова яшчэ штосьці пачытаць, нейкія артыкулы па матывацыі праглядзець за кубачкам кавы. Такая раніца — адзін на адзін з самой сабой. Зімой дабаўляецца прабежка, а летам ёсць магчымасць на веласіпедзе ехаць на працу, падыхаць горадам перад працай. Так я настройваюся на прыход новага дня.

— Пасля ранішняга эфіру ў якім рытме працягваецца дзень?

— Зараз я, акрамя радыё і тэлебачання, працую яшчэ і на партале TUT.BY. І большая частка майго часу занятая працай там. Еду здымаць маадчуванні. Я даглядаю сябе. Касметычных сродкаў у мяне не менш, чым у «салонных» жанчын. Проста я выглядаю па-іншаму, і гэтая ўласцівасць інакш праяўляецца.

Калі ты ў гармоніі з сабой, то і жыццё будзе будавацца па яе законах.

— Публічнасць неяк адбіваецца на вашых паводзінах у жыцці?

— Доўгі час мяне гэта абмяжоўвала, а зараз тое адчуванне засталося ўжо як звычка. Я неяк паспрабавала пайсці з кадра, і ў гэтым плане стала лягчэй, таму што рэдка людзі ўжо на вуліцы пазнаюць. І вось калі ты адчуваеш сябе звычайным чалавекам, то і свабоды ў дзеяннях больш. Мне ніколі не падабалася, калі на вуліцы пазнавалі ці калі прыходзіш на нейкае мерапрыемства і чуеш шэпт за спінай, бо ўвесь час прысутнічае думка — за табой назіраюць. Зараз я мала дзе бываю і менш сутыкаюся з цікаўнымі позіркамі. І мне падабаецца гэта.

— Музыка — ваша стыхія?

— Музыка — амаль усё ў маім жыцці. Яна суправаджае мяне, дзе б я ні знаходзілася і чым бы ні займалася. Музыка дапамагае пісаць. Калі я спяваю ці іграю, то атрымліваю медытатыўнае задавальненне. Лічу, што чалавек займаецца сваёй справай, калі ў працэсе ні на што не адцягваецца яго ўвага і ён ні пра што не думае, акрамя яе.

